# ІНФАРМАЦЫЙНЫ ЛІСТ

Віцебская абласная бібліятэка запрашае прыняць удзел у **IX навукова-практычнай канферэнцыі «Віцебскі край»**, прысвечанай 85-годдзю ўтварэння Віцебскай вобласці.

**Арганізатары канферэнцыі:**

Дзяржаўная ўстанова «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна»

Дзяржаўная навуковая ўстанова «Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі»

Установа культуры «Віцебскі абласны краязнаўчы музей».

**Дата правядзення:** 23 лістапада 2023 года.

**Месца правядзення:** ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна» (Рэспубліка Беларусь, г. Віцебск, вул. Леніна, д. 8а).

**Праблемнае поле канферэнцыі:**

- Віцебская вобласць у кантэксце гісторыі краіны
- Гісторыя і культура Падзвіння (ад старажытнасці да сучаснасці). Крыніцы па гісторыі Падзвіння
- Малая радзіма: гісторыя родных мясцін
- Гісторыя краязнаўства
- Этнаграфія і фальклор
- Літаратуразнаўства і мовазнаўства
- Праблемы архівазнаўства і археаграфіі
- Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства
- Музейнае краязнаўства
- Экскурсійная справа і краязнаўства
- Царкоўнае краязнаўства
- Праблема падрыхтоўкі і выдання краязнаўчай літаратуры
- Краязнаўства ў вучэбна-выхаваўчым працэсе.

**Мовы канферэнцыі:** беларуская, руская.

**Умовы ўдзелу:**

Для ўдзелу ў канферэнцыі неабходна не пазней за 23 кастрычніка 2023 года накіраваць на электронны адрас аргкамітэта **kray@vlib.by** тэкст даклада, а таксама заяўку з указаннем наступных звестак:

-  прозвішча, імя, імя па бацьку;
-  вучоная ступень, званне;
-  месца работы, пасада;
-  тэлефон з указаннем кода горада;
-  e-mail;
-  тэма даклада;
-  форма ўдзелу (вочная ці завочная);
-  патрэба ў зборніку матэрыялаў канферэнцыі (колькасць экзэмпляраў для набыцця).

Даючы гэтыя звесткі, ўдзельнік канферэнцыі тым самым пагаджаецца на апрацоўку персанальных дадзеных.

Плануецца выданне зборніка. **Аргкамітэт пакідае за сабой права адбору дакладаў для ўдзелу ў канферэнцыі і артыкулаў для апублікавання.** Друкаваны варыянт зборніка будзе распаўсюджвацца па сабекошце па папярэдняй замове, пададзенай пры рэгістрацыі ўдзельнікаў канферэнцыі. Электронны варыянт будзе размешчаны на афіцыйным сайце Віцебскай абласной бібліятэкі імя У. І. Леніна ў фармаце даступным для скачвання.

**Патрабаванні да афармлення дакладаў:**

1. Прозвішча, імя, імя па бацьку (поўнасцю) аўтара/суаўтара, горад, краіна, назва даклада.
2. Аб'ём даклада з ілюстрацыямі і дадаткамі – не больш за 7 старонак фармата А4, Times New Roman, 13 кегль, палутарны міжрадковы інтэрвал, тып файла – doc ці rtf (Microsoft Word). Палі – 25 мм з усіх бакоў. Абзацны водступ – 1,25 см.
3. Спіс выкарыстаных крыніц афармляецца пасля асноўнага тэксту **ў алфавітным парадку**.
4. Тэксты дакладаў неабходна прыслаць у электронным варыянце ў рэдактары MS Word.

**Патрабаванні да электронных прэзентацый:**

- Тып файла – ppt Microsoft Power Point.

**Выдаткі на праезд, пражыванне і харчаванне** – за кошт камандзіруючых арганізацый.

**Каардынатары:**

**Рагачова Ларыса Іванаўна**,

загадчык аддзела краязнаўства Віцебскай абласной бібліятэкі імя У. І. Леніна.

Тэлефоны:

+375 (212) 67 49 11

E-mail: **kray@vlib.by**

**Бараноўскі Аляксандр Віктаравіч**,

загадчык аддзела навукова-інфармацыйнай работы Інстытута гісторыі НАН Беларусі.

E-mail: **a.baranouski@history.by**